Як адзначае А. Шалемава, сваім пафасам артыкул «Безумец» часткова супадае з настроем публіцыстычных матэрыялаў на рускай і ўкраінскай мовах, у якіх М. Багдановіч раскрываў своеасаблівасці беларускага нацыянальна-вызваленчага руху пач. XX ст., яго адраджэнскі характар. У лепшых прадстаўніках гэтага руху паэт і публіцыст бачыў высокую адданасць праўдзе, самахвярнасць. Аўтар спалучае пафас нацыянальна-вызваленчай барацьбы з матывам М. Горкага «Безумству храбрых поём мы песню». Магчыма, у атмасферы нявер'я антырэвалюцыйных, антынацыянальных сіл у справу нацыянальна-культурнага адраджэння беларускага народа М. Багдановіч праецыраваў лёс Галілея, вучонага-папярэдніка, непасрэдна і на сябе. Таму твор робіцца своеасаблівым маніфестам свабоднага духу, няскоранасці, вернасці высокай ідэі. Публіцыст узвышае, гераізуе «ўтрапёных», ставіць іх у агульначалавечы рад непераможных праўдалюбцаў, якія сваім інтэлектам і здольнасцямі пранізваюць цёмную даль стагоддзяў. Ён проціпастаўляе праўдзівы суд гісторыі і ганебнае судзілішча цемрашалаў, калі вучоны быў вымушаны ўрачыста каяцца ў сваіх навуковых ідэях, як у цяжкіх грахах, выракацца іх, як памылак.

Галілеа Галілей узвышае сябе над абставінамі адным жэстам, адной фразай-сцверджаннем «А ўсё ж такі яна круціцца!». Яркім публіцыстычным штрыхом з'яўляецца ўведзенае ў артыкул чатырохрадкоўе з верша П. Беранжэ «Les fous» («Безумцы»). *«Если б завтра земли нашей путь / Осветить утром солнце забыло, / Тотчас, верно б, весь мир осветила / Мысль безумца какого-нибудь»* [1, с. 345]. Відавочны асветніцкі рацыяналізм Багдановіча ўдала знітоўвае спрадвечныя матывы барацьбы святла і цемры з непарушнай верай у перамогу розуму.

**Заключэнне.** Зварот да тэкстаў трыялета М. Багдановіча «Калісь глядзеў на сонца я… » і публіцыстычнай нататкі «Безумец» пераконвае ў тым, што асоба Галілея прыцягвала асаблівую ўвагу беларускага класіка. Па-першае, гэты вобраз выступае носьбітам спрадвечнага матыву барацьбы святла і цемры. Акрамя таго, можна з вялікай доляй упэўненасці сцвярджаць, што М. Багдановіч праецыраваў лёс славутага вучонага і непасрэдна на сябе, імкнучыся гэтак жа ўзвысіцца над неспрыяльнымі жыццёвымі абставінамі: апошнія гады жыцця слабы здароўем Галілей правёў у адзіноце і слепаце. Мовай публіцыстыкі М. Багдановіч стварае вобраз чалавека, апантанага ідэяй, падкрэслівае яго вялікую ролю ў гісторыі навукі, а сродкамі мастацкага маўлення супрацьпастаўляе сонца і цемру, высокае і нізкае, прыгожае і агіднае.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Багдановіч, М.* Поўны збор твораў : у 3 т / М. Багдановіч. — 2-е выд. — Мінск : Беларус. навука, 2001. — Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. — 752 с.

2. *Заяц, Н. В.* Трыялет Максіма Багдановіча: новы змест традыцыйнай формы [Электронны рэсурс] / Н. В. Заяц. — Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/bitstream/doc/pdf/ . — Дата доступу: 10.04.2022.

3. *Базар, Н. М.* Інтэртэкстуальнасць беларускай паэзіі мяжы XX—XXI стст.: функцыі і спецыфіка : аўтарэф. … дыс. канд. філал. навук : 10.01.01 / Н. М. Базар ; ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі". — Мінск, 2021. — 30 с.

4. *Шоричева,* А. Свет далёких планет / А. Шоричева // Загадки истории. — 2022. — № 9. — С. 23.

5. Увлечение астрономией довело Галилея до слепоты [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://mir-znaniy.com /uvlechenie-astronomiej-dovelo-galileya-do-slepoty/ . — Дата доступу: 10.04.2022.



УДК 37.016:811.161.3:371.39



**В. І. Патаповіч, В. М. Шавель**

*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*


## АКТЫВІЗАЦЫЯ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ ТВОРЧЫХ ЗАДАННЯЎ

**Уводзіны.** Адным з самых распаўсюджаных і правераных практыкай школьнага навучання шляхоў павышэння эфектыўнасці ўрокаў беларускай мовы ў школе з'яўляецца выкарыстанне творчых заданняў.

Метады і формы арганізацыі сучаснага ўрока павінны быць арыентаваны не на засваенне гатовых ведаў, а на іх самастойнае адкрыццё, на развіццё творчых здольнасцей і актывізацыю пазнавальнай дзейнасці вучняў, бо «развіццёвы эфект урока дасягаецца, з аднаго боку, за кошт сацыяльна і педагагічна абумоўленага, маўленча арыентаванага зместу навучання, а з другога — за кошт спецыяльным чынам арганізаванай вучэбнай дзейнасці як дзейнасці пошукавай, пазнавальна-актыўнай, заснаванай на вырашэнні супярэчнасцей ў працэсе прадметна арыентаванага суразмоўніцтва» [1, с. 111]. Пазнавальная актыўнасць рэалізуецца тады, калі вучань адчувае патрэбу рашыць тую ці іншую задачу і ўмее карыстацца рознымі спосабамі рашэння такіх задач, выказаць індывідуальнае бачанне аб'екта, рабіць самастойныя вывады.


© Патаповіч В. І., Шавель В. М., 2022



Репозиторий БарГУ

**Асноўная частка.** Настаўнікі беларускай мовы часта сутыкаюцца з праблемай правільнага, дакладнага, звязнага маўлення вучняў. На ўроках беларускай мовы, дзе неабходна ўмець выказвацца, граматна пісаць, назіраецца дэфіцыт маўленчых уменняў і навыкаў школьнікаў, а развіццё маўлення — гэта адначасова і развіццё асобы чалавека, яго здольнасцей, інтэлекту, мыслення, маралі. З усіх ведаў і ўменняў, якімі павінен авалодаць сучасны вучань, адным з самых важных і неабходных для далейшай паспяховай дзейнасці з'яўляецца ўменне дакладна, лагічна выражаць свае думкі, будаваць зносіны ў залежнасці ад сітуацыі, захоўваць змястоўнасць, граматнасць выказвання, уменне прыгожа гаварыць, граматна пісаць, а значыць, мець дастатковы лексічны запас.

Звязнае маўленне, як адзначае Г. М. Валочка, «з'яўляецца адным з напрамкаў у развіцці маўлення школьнікаў і мае на мэце фарміраванне ўменняў і навыкаў звязнага выкладу думак у вуснай і пісьмовай форме» [2, с. 13]. Таму, каб пазбегнуць цяжкасцей пры вывучэнні беларускай мовы, настаўнік павінен прапанаваць такі матэрыял на ўроку, калі кожны вучань у класе можа праявіць сябе паспяхова, а інакш цікавасць да прадмета страчваецца.

Грунтоўнымі ведамі вучань авалодвае толькі тады, калі будзе непасрэдным удзельнікам навучальнага працэсу на ўроку. Практыка вядучых настаўнікаў беларускай мовы паказвае, што павышэнне ўзроўню вучэбнай матывацыі магчыма толькі пры комплексным выкарыстанні шматлікіх метадаў, прыёмаў, спосабаў арганізацыі вучэбнай дзейнасці. Адным з такіх спосабаў, які дазваляе найбольш эфектыўна пачынаць ці працягваць вывучэнне матэрыялу, з'яўляецца прымяненне творчых заданняў. Менавіта гэта дазваляе вучням пераадолець складанасці засваення тэмы з аднаго боку і адначасова дае магчымасць узняць урок на якасна новы ўзровень.

У метадычных даведніках няма адзінага вызначэння паняцця «творчае заданне». Так, Г. В. Маргунова лічыць, што «творчыя заданні — гэта такія трэніровачна-навучальныя заданні, якія, як правіла, маюць некалькі форм выканання, алгарытм работы, логіку мыслення, праяўленне фантазіі, магчымасць праявіць творчыя здольнасці на сваім ўзроўні» [3, с. 15].

На думку Л. С. Выгоцкага, творчай дзейнасцю называецца «дзейнасць чалавека, якая стварае штосьці новае, усё роўна ці будзе гэта створанае творчай дзейнасцю нейкім прадуктам ці вядомай пабудовай розуму або пачуцця, якое жыве толькі ў самім чалавеку. Гэта стварэнне новага, прыгожага, яно супрацьстаіць шаблону, яно напаўняе жыццё радасцю, уздымае патрабаванне да ведаў, работы думкі, уводзіць дзіця ў атмасферу вечнага пошуку» [4, с. 26].

Выкарыстанне загадак на ўроках мовы дазваляе не толькі ўзбагаціць слоўнікавы запас, засвоіць граматычны лад мовы, але і развіваць вобразнае мысленне навучэнцаў.

Уменне ўдала карыстацца родным словам беларусы засведчылі ў загадках, а таксама народных казках, песнях і прыпеўках, прыказках і прымаўках. Мова беларускіх загадак — гэта жывая мова народа, насычаная яркай, сакавітай прадметнай лексікай, рухомым сінтаксісам.

Адметнасць загадак заключаецца ў тым, што іх утылітарны момант пранізаны паэзіяй. На думку Н. С. Гілевіча, «загадкі прызначаны перш за ўсё для таго, каб адкрываць чалавеку паэзію ва ўсім, што яго акружае, каб развіваць ў ім здольнасць глядзець на свет навакольных прадметаў і з'яў вачыма паэта» [5, с. 409].

На думку А. Гурскага, функцыі загадак можна падзяліць на шэсць блокаў:

1) функцыі сацыялізацыі індывіда, камунікацыі, псіхатэрапеўчага ўздзеяння;
2) логіка-гнастычная функцыя, звязаная з пазнаннем і яго лагічнай структурай;
3) інфармацыйна-камунікатыўная;
4) лінгвістычная, моўная функцыя;
5) магічная, рэлігійная, сакральная, сімвалічная і забаўляльна-гульнёвая функцыя;
6) аксіялагічная (уяўленне аб каштоўнасцях).

У загадках выкарыстоўваюцца такія моўныя сродкі, якія найлепш адпавядаюць утойванню прадмета і адначасова ствараюць яскравы вобраз. Гэта сродкі мастацкага іншасказання — метафара, параўнанне, эпітэты, таўталогія, гіпербала і літота.

З загадкамі як адметным фальклорным жанрам вучні знаёмяцца яшчэ ў дзіцячым садзе і пачатковай школе. Гэта «неабходна ўлічыць настаўніку, рыхтуючыся да ўрокаў, на якім веды вучняў аб гэтым жанры паглыбляюцца і ўдасканальваюцца» [6, с. 46].

Разгадванне загадак «развівае ў вучняў здольнасць да аналізу, абагульнення; фарміруе ўменне разважаць, рабіць высновы; развівае памяць, увагу, уяўленне, актыўны слоўнік, узбагачае слоўнікавы запас; знаёміць дзяцей з вобразным ладам мовы; развівае творчае, нестандартнае мысленне; развівае пачуццё гумару; выхоўвае знаходлівасць» [7, с. 15].

Атрыманыя веды пра загадкі ў пачатковай школе вучні абагульняюць і замацоўваюць і на ўроках беларускай літаратуры ў 5 класе. Загадкі ілюструюць і пацвярджаюць моватворчыя здольнасці народа. Усе магчымыя граматычныя формы назоўнікаў, дзеясловаў, прыслоўяў, лічэбнікаў і іншых часцін мовы выявіліся ў загадкавай паэзіі.

Карыснай работай на ўроку беларускай мовы можа стаць калектыўнае складанне загадак вучнямі. У практыцы навучання беларускай мове ў сярэдніх класах вылучаюцца наступныя віды працы з загадкамі: адгадванне загадак; групоўка загадак па тэме; запамінанне загадак і загадванне іх сябрам; складанне слоўнічкаў з загадкамі (з ілюстраваннем); падбор загадак да тэмы ўрока; адрозніванне загадак ад іншых твораў вуснай народнай творчасці малых жанраў; гульня-віктарына; складанне загадак і інш. [8].



Рэпазіторый БарДУ

А. А. Несцярэнка лічыць, што «першапачаткова, перад складаннем загадак, варта навучыцца сістэматызаваць прадметы па некаторых прыметах: форма, колер, памер, рэчыва» [9, с. 46]. Далей адбываецца лагічны пераход да складання загадак па табліцах.

У школьным навучанні настаўнікі часта выкарыстоўваюць наступны алгарытм складання загадкі:

1) выбраць аб’ект;

2) апісаць некалькі характэрных прымет данага аб’екта;

3) выключыць аб’ект, які валодае такімі ж прыметамі;

4) адрэдагаваць атрыманую загадку (можна зрабіць яе рытмічнай або рыфмаванай) [9].

Так, у пачатку навучальнага года вучні 5 класа пачынаюць вывучаць раздзел «Мова — найважнейшы сродак зносін», які ўключае тэму «Чалавек і мова. Камунікты ўная функцыя мовы». На ўроку можа быць выкарыстаны дыдактычны матэрыял у выглядзе тэкстаў «Мова зносін», «Кніга для сляпых». Вучні ўспамінаюць інфармацыю пра мову і яе месца ў жыцці народа, разважаюць аб ролі кнігі як сродку перадачы і захоўвання інфармацыі. Каб разнастаіць традыцыйны ўрок, зрабіць яго творчым, вучням можа быць прапанавана скласці загадкі пра кнігу.

На ўроку па тэме «Дзеяслоў. Часы дзеяслова» вучням 5 класа варта прапанаваць скласці загадку пра сонца, абапіраючыся на табліцу А. А. Несцярэнкі «Загадкі па дзеянні» (табліца 1).

Т а б л і ц а 1 — Загадкі па дзеянні

| Што робіць? | Што ж такое? |
|---|---|
| Свеціць, грэе, гарыць, устае, будзіць, выкрадваецца, усміхаецца | Агонь, зорка, святло, надзея, печ, вогнішча |

Аналіз табліцы і асаблівасцей яе выкарыстання праводзіцца калектыўна. Мяркуем, што ў выніку сумеснай працы настаўніка і вучняў атрымаюцца наступныя загадкі: *Гарыць, але не агонь. Грэе, але не печка (Сонца); Гарыць, але не вогнішча. Будзіць, але не гадзіннік (Сонца).*

Пры вывучэнні тэмы «Граматычная сувязь прыметніка з назоўнікам» на этапе замацавання вучні могуць складаць загадкі па прымеце прадмета. Напрыклад: *Чырвоны, але не памідор; салодкі, але не цукар; круглы, але не мяч (Кавун)*; *Халодны, але не лёд. Растае, але не цукар (Снег)*

**Заключэнне.** Для паспяховага развіцця звязнага маўлення вучняў на ўроках беларускай мовы ў сярэдніх класах, як пацвярджае практыка школьнага навучання, эфектыўна выкарыстоўваць складанне загадак пры вывучэнні тэм «Значэнне слова», «Назоўнік», «Род назоўнікаў», «Лік назоўнікаў», «Прыметнік», «Дзеяслоў». Вучні з задавальненнем і без цяжкасцей выконваюць заданні па складанні загадак рознага тыпу.

Стварэнне тэкстаў у форме загадкі — адзін з прыёмаў, які дапамагае школьнікам не проста запамінаць, але свядома засвойваць даступныя для іх разумення жанравыя асаблівасці тэкстаў, развівае звязнае маўленне, абуджае назіральнасць дзяцей, вучыць іх выказваць свае думкі, актывізуе іх пазнавальную дзейнасць.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Подласый, И. П.* Педагогика: новый курс : учеб. для студ. высших учеб. заведений : в 2 кн. / И. П. Подласый. — М. : ВЛАДОС, 2003. — Ч. 1. — 309 с.

2. *Валочка, Г. М.* Тэарэтыка-метадычныя асновы развіцця звязнага маўлення вучняў на ўроках беларускай мовы : 5—10 кл. / Г. М. Валочка. — Мінск : НІА, 2005. — 210 с.

3. *Маргунова, Г. В.* Метады і прыёмы развіцця творчых здольнасцей вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры: [Электронны рэсурс] / Г. В. Маргунова. — Рэжым доступу: http://ezery.cherikov.edu.by/ru/main.aspx?guid=1871 . — Дата доступу: 01.12.2021.

4. Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Беларуская мова. Беларуская літаратура V—IX класы. — Мінск : НІА, 2017. — 26 с.

5. Беларуская вусна-паэтычная творчасць: падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / К. П. Кабашнікаў [і інш.]. — Мінск : Лексіс, 2000. — 512 с.

6. *Смыкоўская, В. І.* Беларуская літаратура ў 4 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў / В. І. Смыкоўская. — Мінск : Нар. асвета, 2003. — 190 с.

7. *Дамброўская, С. В.* Развіццё звязнага маўлення вучняў 5—6 класаў на ўроках беларускай мовы / С. В. Дамброўская // Бел. мова і літ. — 2015. — № 2. — 64 с.

8. Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання» [Электронны рэсурс] / склад. В. І. Свірыдзенка, Н. М. Антановіч — Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/bitstream/doc/2236/3/УМК_ методыка.pdf . — Дата доступу: 15.11.2021.

9. *Нестеренко, А. А.* Страна загадок. О развитии творческого мышления детей. ТРИЗ-ОТСМ [Электронны рэсурс] / А. А. Нестеренко. — Рэжым доступу: https://jlproj.org/this_bibl/riddles_polina_pict_ru.pdf . — Дата доступу: 26.11.2021.


Рэпазіторый БарГУ